аўдыторыі». Музеі павінны актыўна займацца фарміраваннем і вывучэннем «сваёй» аўдыторыі.

На сённяшні дзень вызначэнне крытэрыяў эфектыўнасці работы музея — адно з самых складаных пытанняў. Інавацыі не адлюстроўваюцца ў лічбавых паказчыках. Аспекты, звязаныя з якасцю музейнай работы, таксама дакументальна нормамі не вызначаюцца. З мэтай удасканалення музейнай работы ў некаторых рэгіёнах Расійскай Федэрацыі ствараюцца мадэльныя стандарты дзейнасці музеяў з мэтай замацавання ў выглядзе нарматываў мінімальна неабходных параметраў, якія могуць забяспечыць эфектыўную жыццядзейнасць музеяў у новых умовах рынку. У Беларусі часткова гэтае пытанне вырашаецца на ўзроўні музейнага заканадаўства.

Для запуску механізмаў распрацоўкі прафесійных стандартаў неабходна актыўнае вывучэнне рынкаў, з якімі працуе музей. Галоўны акцэнт музейнага маркетынгу павінен быць накіраваны на сегментацыю спажывецкага рынку з мэтай выяўлення актуальных запытаў для паспяховага пазіцыянавання музейных паслуг. Прынцыпы і механізмы музейнай палітыкі павінны быць замацаваны ў канцэпцыі і праграмах развіцця музея.



З цягам часу ўменне музея пераўтвараць свой унікальны рэсурсны патэнцыял у прыцягальныя сацыяльна значныя паслугі стане адным з найбольш важных паказчыкаў адаптаванасці да сучасных рэалій і паказальным крытэрыем эфектыўнасці работы ўстановы і яе кіраўніка.

Аляксандр Гужалоўскі

доктар гістарычных навук, прафесар кафедры этналогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Мінск, Беларусь)

## Нацыянальныя музейныя арганізацыі — дзейсны фактар развіцця музейнай справы

Канец XIX — пачатак XX ст. былі часам, калі на еўрапейскім і паўночнаамерыканскім кантынентах сфарміраваўся музей у яго сучасным разуменні. З’яўленню сучаснага музея спадарожнічала фарміраванне органаў кіравання музейнай справай, «музеялогіі» як спецыфічнай галіны ведаў, музейнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуры і перыёдыкі, а таксама нацыянальных музейных арганізацый. Першая з іх з’явілася ў Вялікабрытаніі ў 1889 г. У 1917 г. было абвешчана пра заснаванне музейнага саюза Германіі. З 1947 г. адлічвае свой узрост Канадская музейная асацыяцыя.

Буйнейшая і найбольш уплывовая ў свеце нацыянальная музейная арганізацыя — *Асацыяцыя амерыканскіх музеяў* (ААМ) была створана ў 1906 г. з мэтай кансалідацыі прадстаўнікоў музейнай прафесіі і музеяў ЗША. Яна дзейнічае ў адсутнасці ў краіне дзяржаўных органаў кіравання музейнай справай, аб’ядноўвае амерыканскіх музейных работнікаў усіх спецыялізацый і рангаў — ад інтэрнаў да дырэктараў. У склад асацыяцыі ўваходзіць каля 18 тыс. індывідуальных і 250 карпаратыўных членаў. Усе яны з’яўляюцца членамі аднаго з 13 прафесійных камітэтаў (куратараў, менеджараў, педагогаў, спецыялістаў у галіне новых тэхналогій і інш.).

Асацыяцыя амерыканскіх музеяў — гэта разгалінаваная структура са штаб-кватэрай у сталіцы ЗША і шасцю рэгіянальнымі аддзяленнямі, якія ахопліваюць усю тэрыторыю краіны — ад Новай Англіі да Каліфорніі. У асацыяцыі працуюць дзясяткі спецыялістаў на аплочваемых пасадах і ў якасці валанцёраў. Згодна з распрацаванай місіяй, асацыяцыя прапануе стандарты музейнай работы ў краіне, займаецца зборам інфармацыі пра ўсе бакі музейнай дзейнасці і распаўсюджвае лепшы вопыт, абараняе інтарэсы музеяў і музейнай грамадскасці перад уладай. З гэтай мэтай у штаб-кватэры ААМ у Вашынгтоне створаны інфармацыйны цэнтр, акрэдытацыйная камісія, юрыдычная служба.

Сярод шматлікіх праграм, якія рэалізуе асацыяцыя, да найбольш папулярных адносяцца «Міжнародны дзень музеяў», «Ініцыятывы малых музеяў», «Разнастайны музей», «Музейныя прадметы з нацысцкай Германіі». Штогод ААМ уручае 12 узнагарод у розных намінацыях індывідуальным і карпаратыўным членам за высокія прафесійныя дасягненні. У апошні час кіраўніцтва ААМ распрацавала стратэгічны план «SPARK», які закліканы аптымізаваць музейную дзейнасць у краіне. ААМ выдае ўласны бюлетэнь, а таксама часопіс «Музей» (6 нумараў у год). З 2007 г. Раду ААМ узначальвае спецыяліст у галіне музейнага менеджменту Форд Бел.

У 1997 г. няўдалая спроба стварыць Беларускую асацыяцыю музеяў (БелАМ) была здзейснена ў Мінску. У той час прадстаўнікі музейнай прафесіі краіны ў сваёй асноўнай масе не падтрымалі ідэю пра неабходнасць самаарганізацыі. Сёння пытанне пра беларускую нацыянальную музейную асацыяцыю застаецца па-ранейшаму адкрытым.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальнасць гэтаму пытанню надае паспяховая дзейнасць падобных арганізацый нашых краін-суседзяў.

Адзінай арганізацыяй Расійскай Федэрацыі, якая аб’ядноўвае музеі як грамадскія інстытуты з’яўляецца *Саюз музеяў Расіі* (*ICOM* Расіі фарміруецца на аснове асабістага членства). Створаны ў лістападзе 2001 г., сёння саюз аб’ядноўвае больш за 400 музейных устаноў з 75 рэгіёнаў краіны. Сваю місію Саюз музеяў Расіі вызначыў як аб’яднанне намаганняў яго членаў па фарміраванню, захаванню, вывучэнню і прадстаўленню музейнага фонду Расійскай Федэрацыі, абарону інтарэсаў музеяў Расіі перад органамі дзяржаўнай улады і грамадскімі інстытутамі.

Саюз музеяў Расіі актыўна ўдзельнічае ў абмеркаванні ўсіх заканадаўчых і нарматыўна-прававых актаў, што тычацца дзейнасці музеяў краіны, прадстаўляе музеі ў саветах і камісіях, якія ствараюцца пры прэзідэнце, парламенце і ўрадзе, супрацоўнічае з кіраўніцтвам рэгіёнаў. Ён спрыяе найбольш поўнаму раскрыццю адукацыйных і асветніцкіх рэсурсаў расійскіх музеяў, наладжвае міжмузейны абмен у маштабах краіны і за мяжой. Асобае месца ў дзейнасці Саюза займае ўкараненне новых тэхналогій у сучасную музейную практыку, іх гарманізацыя з прыродай музейнай дзейнасці. Саюз музеяў Расіі, які ад пачатку ўзначальвае дырэктар Эрмітажа М. Б. Піятроўскі, выступае сазаснавальнікам Усерасійскага музейнага фестывалю «Інтэрмузей», каардынатарм шэрага нацыянальных музейных праграм і конкурсаў.

*Асацыяцыя супрацоўнікаў польскіх музеяў*, галоўны офіс якой знаходзіцца ў Кракаве, была створана ў 1996 г. Адпаведна статута — гэта няўрадавая некамерцыйная ўстанова, якая мае дзве галоўныя мэты: 1) распрацоўка і падтрымка навуковых, арганізацыйных, выдавецкіх і адукацыйных ініцыятыў, звязаных з паляпшэннем дзейнасці польскіх музеяў; 2) прадстаўленне і абарона правоў і інтарэсаў музейных супрацоўнікаў Польшчы. Акрамя таго, Асацыяцыя супрацоўнікаў польскіх музеяў актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы заканадаўчых актаў, якія тычацца музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Яна выдае інфармацыйны бюлетэнь і каталог музейных публікацый. Структурна асацыяцыя складаецца з цэнтральнага кіраўніцтва на чале са старшынёй (гэту пасаду займае галоўны захавальнік Музея незалежнасці ў Варшаве Анджэй Катэцкі), а таксама 11 рэгіянальных аддзелаў. Вярхоўным органам нацыянальнай арганізацыі супрацоўнікаў польскіх музеяў з’яўляецца агульны з’езд, дзе выбіраюцца кіраўнічыя структуры, выпрацоўваецца план дзейнасці на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наступныя тры гады, абмяркоўваюцца найбольш вострыя пытанні музейнага жыцця краіны.

*Усеўкраінская асацыяцыя музеяў* згодна статута з'яўляецца недзяржаўнай, непалітычнай, некамерцыйнай установай, якая на добраахвотных пачатках аб'ядноўвае музеі ўсіх відаў, профіляў і форм уласнасці. Членства ў ёй можа быць індывідуальным і калектыўным. Вярхоўны орган асацыяцыі — агульная канферэнцыя. Асацыяцыя паўстала ў 2004 г. з мэтай дапамогі ў рэалізацыі і абароне законных прафесійных, сацыяльных, культурных, асветніцкіх, навуковых і іншых агульных інтарэсаў прадстаўнікоў музейнай супольнасці. Усеўкраінская асацыяцыя музеяў у сваім статуце вызначае досыць шырокае кола задач: усталяванне сувязей і абмен інфармацыяй паміж прадстаўнікамі музейнай прафесіі, удасканальванне ўзаемаадносін паміж украінскімі музеямі і ўладай, паляпшэнне якасці падрыхтоўкі музейнага персаналу, удзел ва ўкараненні сучасных музейных тэхналогій, менеджменту, маркетынгу ў музейную справу, у рэстытуцыі нацыянальных музейных каштоўнасцей і інш. Старшынёй асацыяцыі з'яўляецца генеральны дырэктар Нацыянальнага Кіева-Пячэрскага гісторыка-культурнага запаведніка С. П. Кралевец. Ва Украіне існуюць таксама рэгіянальныя музейныя арганізацыі, напрыклад, Асацыяцыя запаведнікаў і музеяў Крыма. 

У якасці сваёй галоўнай задачы, *Асацыяцыя літоўскіх музеяў*, створаная ў 1995 г., вызначае агульную падтрымку музейнай дзейнасці ў краіне, а таксама наладжвае супрацоўніцтва і ўзаемадапамогу паміж літоўскімі музейнымі супрацоўнікамі. Усе стратэгічныя пытанні дзейнасці асацыяцыі вырашаюцца на Генеральнай асамблеі, удзел у якой бяруць усе члены асацыяцыі, якія падзяляюцца на правадзейных, асацыяцыйных, ганаровых і спонсараў. У складзе асацыяцыі дзейнічаюць шэсць прафесійных камітэтаў (менеджменту, адукацыі, захавання калекцый і інш.). Кіраўніцтва Асацыяцыі літоўскіх музеяў, патронамі якой з'яўляюцца Міністэрства культуры Літвы і Літоўскі мастацкі музей, выдае «Музеялагічны бюлетэнь» і часопіс «Літоўскія музеі». Узначальвае асацыяцыю дырэктар Музея «Аўшра» ў Шаўляе Раймундас Балза.

Падобнае бачанне сваёй місіі і ў *Латвійскай асацыяцыі музеяў*, якую ўзначальвае супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Латвіі Інэта Сімансоне. Латвійская асацыяцыя яднае сёння больш за 100 музеяў, супрацоўнікі якіх звяртаюцца ў яе штаб-кватэру па шматлікіх пытаннях — ад працаўладкавання да дапамогі ў вырашэнні юрыдычных спрэчак. З 1998 г. Латвійская асацыяцыя музеяў ажыццяўляе акрэдытацыю музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ